**ГРЫМАЦЬ** Адам Антонавіч [17. 10. 1938, в. Ілья Вілейскага раёна – 8. 11. 2000], беларускі вучоны-педагог. Кандыдат педагагічных навук (1970). Прафесар (1998).

Скончыў філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1960). Працаваў настаўнікам. Вучыўся ў аспірантуры (1967–1970). Працаваў у Эрфурцкай Вышэйшай педагагічнай школе (Германія) на пасадзе дацэнта (1972–1974). З 1975 г. на працы ў БДПУ: дацэнт кафедры педагогікі, дэкан факультэта павышэння кваліфікацыі дырэктараў школ, прарэктар, загадчык кафедры педагогікі. Правадзейны член Міжнароднай акадэміі акмеалогіі (1998). Правадзейны член Беларускай акадэміі адукацыі (1998). Заслужаны работнік адукацыі (1998).

Навуковы дыяпазон А. А. Грымаця надзвычай шырокі, ён з’яўляецца сааўтарам манаграфій: “Сістэма шматузроўневай падрыхтоўкі педагагічных кадраў” (1993), “Аксіялагічныя праблемы выхавання студэнтаў педагагічных ВНУ” (1994), “Нацыянальная сістэма падрыхтоўкі педагагічных кадраў” (1994), “Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці будучых педагогаў” (1996), “Падрыхтоўка педагога-даследчыка ва ўмовах універсітэта” (1997), “Тэарэтычныя аспекты сацыялізацыі школьнікаў” (1997) і інш.

Значны ўклад унёс А. А. Грымаць у развіццё методыкі выкладання беларускай літаратуры: яго дысертацыйнае даследаванне прысвечана праблеме маральнага выхавання вучняў сярэдняга школьнага ўзросту на ўроках беларускай літаратуры. Па тэме дысертацыі выдадзены метадычны дапаможнік “Фарміраванне маральных ідэалаў вучняў (на матэрыяле беларускай літаратуры)” (1978). Над гэтай праблемай А.А. Грымаць працаваў і далей. Вынікам шматгадовай працы стала манаграфія “Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў” (2000).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ